39. Раппопорт, П.А. Русская архитектура X–XIII вв. Каталог памятников / П.А. Раппопорт // Археология СССР. САИ. – Л., 1982. – Вып. Е1-47. – 136 с.
40. Раппопорт, П.А. Церковь Благовещения в Витебске / П.А. Раппопорт // Памятники культуры. Новые открытия. Ежегодник 1985. – М., 1987. – С. 522–528.
41. Раппопорт, П.А. Строительное производство Древней Руси (X–XIII вв.) / П.А. Раппопорт. – СПб. : Наука, 1994. – 160 с.
42. Русско-Ливонские акты, собранные К.Е. Напьерским. – СПб., 1868. – 462 с.
43. Рыбаков, Б.А. История и перестройка / Б. А. Рыбаков; Лит. запись Ю. Нечаева. – М. : Книга. Б.г. (1989). – 77 с., (2).
44. Сапунов, А.П. Витебская старина / А.П. Сапунов. – Витебск, 1883. – Т. 1. – 668 с.
45. Сапунов, А. Оконная рама XII в. из церкви Георгия в Старой Ладоге / А. Сапунов, А. Драги // АСГЭ. – 1962. – Вып. XXIII. – С. 14–16.
46. Сахарова, И.Г. О технике настила майоликовых полов / И.Г. Сахарова // КСИИМК АН СССР. – М., 1957. – Вып. 68. – С. 138–141.
47. Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв.: Архитектурно-археологический анализ / О.А. Трусов. – Минск : Наука и техника, 1988. – 160 с.: ил.
48. Трусов, О.А. Сравнительный анализ строительной техники Черниговского, Полоцкого (Витебского) и Гродненского монументального зодчества / О.А. Трусов // Проблемы археологии Южной Руси : материалы историко-археологического семинара «Чернигов и его округа в IX–XIII вв.», Чернигов, 26–28 сентября 1988 г. – Киев, 1990. – С. 66–69.
49. Чукова, Т.А. Древнерусские керамические поливные плитки / Т.А. Чукова // КСИА АН СССР. – М., 1987. – Вып. 190. – С.
50. Чурканова, Н.В. Оконница как элемент средневекового храма / Н. В. Чурканова // Проблемы изучения древнерусского зодчества : по материалам архитектурно-археологических чтений, посвященных памяти П.А. Раппопорта, Санкт-Петербург, 15–19 января 1990 г. – СПб., 1996. – С. 38–42.
51. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов / АН БССР, Ин-т истории ; ред. А.Г. Митрофанов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 136 с.: ил.
52. Щапова, Ю.Л. Плитчатый пол вновь открытой церкви на Соборной горе Смоленска / Ю.Л. Щапова // Культура Древней Руси. – М., 1966. – С. 302–306.
53. Щапова, Ю.Л. Стекло Киевской Руси / Ю.Л. Щапова. – М. : Наука, 1966. – 216 с.
54. Щапова, Ю.Л. Стеклянные изделия древнего Новгорода / Ю.Л. Щапова // МИА СССР. – М., 1963. – № 117. – С. 104–163 с.
55. Stryjkowski, M. Kronika Polska, Litewska, Zmúdzka i Wszystkiej Rusi / M. Stryjkowski. – Warszawa, 1846. – T. 2. – 572 s.


**УДК 902.01(476.5)+692.(476.5)**

## ЭЛЕМЕНТЫ ЖЫЛЫХ І ГАСПАДАРЧЫХ ПАБУДОЎ ПОЛАЦКА XII–XIV СТСТ. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАСКОПАК ГОРАДА). АГУЛЬНЫ АГЛЯД


***А.Л. КОЦ***
***(Полацкі дзяржаўны ўнверсітэт)***


*Пададзена агульная характарыстыка драўлянай грамадскай забудовы Полацка XII–XIV стст. Пад час раскопак гарадскіх напластаванняў выяўлена больш 80 пабудоў. Разгледжаны асноўныя катэгорыі канструктыўных эленатаў жылых і гаспадарчых пабудоў: асновы будынкаў, сцены, падлога, страха, столь, дзверы, ганкі, завалінкі, платы, а таксама матэрыялы і тэхніка будаўніцтва. Выкарыстоўваюцца дадзеныя раскопак 1950–60-х гг. на Верхнім замку і 1980-х на Вялікім пасадзе.*

Дрэва заўсёды было самым распаўсюджаным матэрыялам для грамадскай забудовы гарадоў і сельскіх паселішчаў у межах лясной зоны Усходняй Еўропы. Полацк не з'яўляецца выключэннем. Характар культурнага слою ў Полацку адмоўна ўплывае на захаванне драўляных канструкцый гарадской забудовы. Прычына гэтаму – амаль поўная адсутнасць так званага "мокрага слою". Асобныя ўчасткі Верхняга замка і заходняя тэрыторыя Вялікага пасаду з'яўляюцца прыдатным месцам па захаванні арганікі. Дрэва выдатна кансервуецца на тэрыторыі ўсходняй часткі Верхняга замка, дзе адбывалася актыўнае нарастанне культурнага слою ў XIII–XIV стст., на дадзеным месцы даследчыкі фіксуюць да 14 будаўнічых гарызонтаў. Таксама шэраг драўляных пабудоў і вулічных насцілаў XII–XVII стст. выяўлены на Вялікім пасадзе (у межах цяперашняй плошчы Свабоды і карпусоў езуіцкага калегіўма). На асобных участках на Ніжне-Пакроўскай вуліцы таксама прысутнічае дрэва ў "мокрым пласце".

Найбольшую цікавасць у вывучэнні драўляных канструкцый уяўляюць раскопкі Верхняга замка, якія праходзілі ў канцы 1950-ых – пачатку 1960-ых гадоў, праведзеныя А.Р. Мітрафанавым [4], Г.В. Штыхавым (усходні раскоп), М.К. Каргерам, В.Р. Тарасенкай [7, с. 35-37], а таксама раскопкі С.В. Тарасава на плошчы Свабоды ў канцы 1980-ых гг. [5, с. 65-66].

Пад час азначаных раскопак выяўлена больш 80 пабудоў, якія захаваліся ў выглядзе зрубаў на вышыню да 1 м і як слупавыя канструкцыі. Г.В. Штыхавым былі вылучаны наступныя катэгорыі пабудоў: жылыя, гаспадарчага прызначэння, вытворчыя будынкі, а таксама пабудовы, прызначэнне якіх не вызначана [7, с. 49]. Таксама да дадзенага спісу варта дадаць катэгорыю пабудоў, якія сумяшчалі ў сабе жылую прастору і рабочую зону [3, с. 25].

Пад час будаўніцтва часцей за ўсё выкарыстоўваліся сасна, радзей елка [7, с. 49; 6, с. 268]. Матэрыялам будаўніцтва таксама выкарыстоўвалі некароную бярозу для насцілу падлогі ў гаспадарчых пабудовах (хлеў), якая перакрывалася слоем гною [7, с. 46], а такама як пераводзіны падлогі [7, с. 47]. Першыя вянцы і падкладкі пад ніжняе бярвенне маглі рабіць з дубу [7, с. 41]. Апошнія выкарыстоўваліся як аснова пад дом. Па матэрыялах Полацка ніжнія падкладкі пад зруб фіксуюцца пераважна ў жылых пабудовах. Выяўлены толькі рэдкія выпадакі суцэльнай вымасткі падкладак пад усе сцены (пабудовы 6А і 6Н усходняга раскопа) [7, с. 41;4, с. 36]. Фіксуюцца прыклады выкарыстання падкладак толькі пад адзін кут пабудовы [7, с. 40; 4, с. 36,]. Пабудова 7 М (усходні раскоп) мела своеасаблівую іншую аснову: на зямлю пад ніжні вянец былі пакладзены два бервяны крыж на крыж, якія канцамі выступалі за межы сцен. Акрамя тога, дадаткова сцены ўмацаваны падкладкамі [7, с. 43]. У іншых выпадках зрубы ставіліся на зямлю без асновы або за аснову выкарыстоўваліся рэшткі папярэдніх пабудоў (канструкцыі 7Н і 7Д усходняга раскопа) [7, с. 41, 42].

Сцены ўсіх будынкаў рубіліся на месцы. Як лічыць Г.В. Штыхаў, са спасылкай на этнаграфічныя матэрыялы, у лесе нарыхтоўвалі бярвенне патрэбнай даўжыні, а на месцы фарміравалі зруб [7, с. 49]. На карысць гэтага сведчаць адсутнасць метак [7, с. 49], а таксама культурны слой з вялікім утрыманнем шчапы, трэсак і іншага будаўнічага смецця [7, с. 37]. Падобны слой сустракаецца і на іншых частках Полацка (даследаванні М.В. Клімава каля плошчы Свабоды) [2, с. 317]. Пры будаўніцтве, галоўным чынам, выкарыстоўвалася жалезная сякера [7, с. 49]. Пры чым А.Р. Мітрафанаў лічыць, што цесляры карысталіся толькі сякерай, ім не завіксавана слядоў працы пілой. Даследчык вызначае выключнае выкарыстанне сякеры ў драўляным грамадскім дойлідстве да XVI–XVII стст. [4, с. 34].

Пад час узвядзення драўляных зрубных канструкцый выкарыстоўвалася тэхніка рубкі ў чашку з астаткам. Даўжыня астатка дасягала 0,2–0,3 м [7, с. 49, 4, с. 34]. У некаторых выпадках астатак ніжніх вянцоў мог выступаць на даўжыню да 1 м [4, с. 34]. Чашка і драка (падоўжны паз) рабіліся ў верхняй частцы ніжняга бервяна. Пры ўзвядзенні сцен выкарыстоўвалася толькі круглае бярвенне [7, с. 49]. Як правіла дыяметр бярвення 0,2–0,3 м характэрны для жылых пабудоў [6, с. 268], у той час як для гаспадарчых пабудоў (хлявоў) – 0,14–0,2 м [7, с. 47, 49]. Сцены жылых дамоў шчыльна праканапачваліся мохам [7, с. 43, 47].

Майстрам-цеслярам старажытнага Полацка быў добра знаёмы і іншы прыём будаўнічай тэхнікі – умацаванне сценаў пры дапамозе слупоў-шул. Але гэты прыём не меў шырокага распаўсюджання ў Полацку і датычыўся толькі гаспадарчых пабудоў. Выяўлена толькі адна пабудова на Верхнім замку, выкананая ў азначанай тэхніцы. Акрамя таго сцены гэтай адзінай пабудовы ўзводзіліся не з бярвення, а з тоўстых дошак, якія канцамі ўмацоўваліся ў прадольныя пазы вертыкальных слупоў. Названая пабудова не ўяўляла сабой самастойнай канструкцыі, а з'яўлялася часткай жылога комплексу – сенямі пры жылым доме [4, с. 35].

Абавязковым элементам усіх пабудоў, не залежна да іх прызначэння, як вызначае А.Р. Мітрафанаў, з'яўляецца драўляная падлога [4, с. 35]. Падлогі ў жылых і гаспадарчых пабудовах можна падзяліць на два віды: калі насціл пакладзены на лагі ці на пераводзіны. Канструкцыя пераводзінаў прадстаўляе сабой аснову падлогі з бярвення, якое канцамі мацавалася ў супрацьлеглых сценах пабудовы [1, с. 25] на ўзроўні першага і другога вянца [7, с. 35], у асобных выпадках, паміж 2 і 3 вянцамі [7, с. 43, с. 50]. Пераводзіны маглі мець глухую або скразную ўрубку. У выпадку апошняй, канцы, у выглядзе астаткаў, выступалі за межы сцяны на адлегласці да 0,4 м [7, с. 42]. Глухая ўрубка зафіксавана толькі ў адным выпадку пад час раскопак у Полацку (у пабудове 7М ва ўсходнім раскопе) [7, с. 43]. Лагі ўяўляюць сабой бярвенне, якое клалася на зямлю без падкладак [7, с. 41], перпендыкулярна адносна дошак насцілу і такім чынам з'яўлялася асновай для падлогі. Як правіла лагі часцей сустракаюцца ў гаспадарчых пабудовах [6] або як аснова насцілу пад маставую [7, с. 40]. Колькасць лаг або пераводзін у пабудовах вагалася ад 2 да 4 у залежнасці ад памеру будынка [4, с. 35]. Сам насціл падлогі ў большасці выпадкаў рабілі з цясін – тоўстых дошак [7, с. 41], якія маглі замацоўвацца клінамі ад сцяны [7, с. 41]. У некаторых выпадках падлогай у хлеве мог служыць насціл з жэрдак ці тонкіх бярвенняў, якія выкарыстоўвалі некаронымі [7, с. 46, 49]. Ва ўсходнім раскопе зафіксаваны адзін выпадак насцілу падлогі ў жылым доме, які зроблены з бярвення другаснага выкарыстання, магчыма, ад папярэдніх пабудоў (пабудова 6Ж усходняга раскопа) [7, с. 40]. Сустракаецца шэраг гаспадарчых пабудоў, дзе падлогай з'яўлялася зямля, перасланая слоем гною [7, с. 47].

Polotsk.su

Элементы страхі і столі пад час раскопак Полацка сустракаюцца вельмі рэдка, пераважна ў выпадках другаснага выкарыстання або загінуўшыя пад час пажару. Рэшткі столі зафіксаваны ў пабудовах 6А і 6Н усходняга раскопа. У цэнтры пабудовы 6А захаваліся абвугленыя рэшткі слупа, які верагодна падтрымліваў бэльку столі – "маціцу" [7, с. 41]. Пабудова 6Н моцна пацярпела ад пажару і, як мяркуе Г.В. Штыхаў, яе верхняя канструкцыя (бервяно дыяметрам 0,42 м) рухнула на падлогу [7, с. 40]. Магчыма, гэта апорны слуп страхі – "закота". На падлозе ў дадзенай пабудове ляжалі абвугленыя рэшткі бярвення, верагодна, рэшткі столі [7, с. 40]. Канструктыўнымі элементамі страхі з'яўляюцца таксама "курыцы", якія сведчаць, што дахі шараговай забудовы старажытнага Полацка былі двухсхільныя [7, с. 49; 4, с. 36].

Дзверы таксама з'яўляюцца вельмі рэдкай знаходкай для Полацка. Відавочна, што яны будаваліся высока – пераважна вышэй трэццяга або нават пятага вянца. Пры раскопках Г.В. Штыхава у слое XIII ст. тройчы знойдзены дзвярныя дошкі. Адна дошка мае даўжыню 0,91 м, шырыню 0,48 м і таўшчыню 0,05 м. На яе паверхні выбраны паз на "ластаўкін хвост". Другая дзвярная дошка мае даўжыню 0,85 м. У ёй захаваўся адзін з пятачных шыпоў, пры дапамозе якіх мацавалася дзвер. У дошку трэццяй дзверы забіты цвік, які, магчыма, мацаваў накладку [7, с. 49]. У раскопках А.Р. Мітрафанава таксама выяўлены фрагмент адной дзверы. Ад яе захаваліся часткі двух дошак, змацаваных разам папярочнымі планкамі ў пазах на "ластаўкін хвост" [4, с. 36]. Фрагмент дзвярнога касяка зафіксаваны ў пабудове 9А усходняга раскопа [7, с. 47]. Рэшткі акон пры раскопках Полацка не выяўлены. Па аналогіям з іншымі гарадамі можна меркаваць, што яны маглі быць валавымі.

Дадатковыя канструктыўныя элементы (ганкі і завалінкі) фіксуюцца ў выключных выпадках. Ганкі, магчыма, уяўлялі насціл з бярвення, якое неаднаразова перасцілалася [7, с. 45]. Ганак мог дасягаць памеру 1,5 × 0,4 м [6, с. 269]. У пабудове 7М выяўлены рэшткі парога [7, с. 45]. Завалінкі рабілі на ўзроўні першага вянца з круглага бярвення, якое са знешняга боку мацавалася колышкамі [7, с. 45, 47].

У раскопах на Верхнім замку і Вялікім пасадзе выяўлены шэраг платоў, якія ўяўлялі сабой частаколы і плятні. Частакол, па апісанні А.Р. Мітрафанава, выглядаў як суцэльная лінія вертыкальных слупоў, таўшчыня якіх не перавышала 0,14–0,15 м. Ніжнія канцы слупоў не былі завостраны, а мелі роўны гарызантальны зрэз. Відавочна, што плот быў пабудаваны шляхам укапвання слупоў у зямлю, але не ўбіваннем апошніх [4, с. 36]. Паборныя платы выглядалі вельмі масіўна і адгароджвалі сядзібу ад вуліцы і суседніх надзелаў [7, с. 40]. У выпадку размежавання пэўных частак сядзібы выкарыстоўваўся лёгкі пляцень. Гэта плот, які складаўся з вертыкальных тонкіх калкоў пераплеценых паміж сабою прутамі (пераважна лазовымі) [6, с. 269].

Такім чынам, драўляная забудова Полацка развівалася сінхронна з іншымі рэгіянальнымі цэнтрамі лясной паласы Усходня Еўропы. Размяшчэнне драўляных канструкцый і падлогі на зямлі без асновы больш характэрна для Полацка, чым для Віцебска або Ноўгарада, дзе глеба больш вільготная. Шчыльнасць забудовы ў XII–XIII стст. была вельмі высокай. Толькі ў асобных выпадках надзелы заможніх раменікаў і баярства маглі мець плошчу больш 1000 м$^2$. Тэмпы змены жылых і гаспадарчых пабудоў былі вельмі высокімі, што падцвярджае інтэнсіўнасць паўсядзённага жыцця ў цэнтры горада. Як паказалі раскопкі на Верхнім замку, драўляныя пабудовы маглі існаваць да 20 гадоў (не больш!). Частае ўзвядзенне новых пабудоў сведчыць аб высокім прафесійным узроўні мясцовых майстроў-цесляроў.

Тэма вывучэння драўлянай забудовы Сярэднявечча і XVI–XVIII стст. з'яўляецца не распрацаванай у кантэксце гісторыі Полацка. Захаванне арганічных рэчываў і драўляных канструкцый вельмі фрагментавана ў гарадскім культурным пласце, што ўскладняе іх вывучэнне. Але вызначаныя тэрыторыі (Вялікі пасад і Верхні замак) з'яўляюцца найбольш перспектыўным месцам па даследаванні жыллёва-гаспадарчых комплексаў XII–XVIII стст. І таму іх вывучэнне, кансервацыя і музеефікацыя вельмі актуальны для Полацкай археалогіі.

ЛІТАРАТУРА

1. Засурцев, П.И. Усадьбы и постройки Древнего Новгорода / П.И. Засурцев // Материалы и исследования по археологии СССР (№ 123). Жилища древнего Новгорода. Труды Ногородской археологическо экспедиции. – М. : Академия наук СССР, 1963. – Том IV. – С. 5–165.
2. Клімаў, М.В. Новыя археалагічныя даследаванні ў гарадах Падзвіння ў 2009 г. / М.В. Клімаў // МАБ. – 2012. – № 23. – С. 313–323.
3. Коц, А.Л. Ювелірная майстэрня XII ст. на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка (па матэрыялах археалагічных раскопак 2013 г.) / Коц А.Л. // Вестн. Полоцк. гос. ун-та. Сер А, Гуманитаные науки. – 2015. – № 1. – С. 18–27.
4. Митрофанов, А.Г. Отчет о раскопках Полоцкой археологической экспедиции Ин-та истории АН БССР в 1959 г./ А.Г. Митрофанов // Фонд археологической научной документации Центрального Научного Архива НАН Беларуси. – Д. 203.
5. Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 183 с.

6. Тарасаў, С.В. Сядзіба полацкіх ювеліраў XII–XIIIстст. / С.В. Тарасаў // ГАППЗ // Матэрыялы IV міжнар. навук. канф., Полацк. – Полацк : НПГКМЗ, 2003. – С. 267–272.
7. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX-XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 136 с.

**УДК 392.1(476)**

# ГАРАДСКІ ЛАНДШАФТ У ТРАДЫЦЫЙНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ[1]

***канд. гіст. навук, дац. У.А. ЛОБАЧ***
***(Полацкі дзяржаўны ўнверсітэт)***

*Разгледжана сімволіка гарадскога ландшафту ў яго архітэктурным і сацыяльным вымярэннях у традыцыйнай карціне свету беларусаў Віцебшчыны. Фальклорнаэтнаграфічныя крыніцы паказваюць, што горад ва ўяўленнях вяскоўцаў характарызуецца амбівалентным чынам. Як максімальна ўпарадкаванае месца з вялікай колкасцю храмаў, горад можа атаясамлівацца са "святым месцам". З другога боку, шчыльнасць забудовы, гіганцкія архітэктурныя формы, экалагічная забруджанасць і сацыяльная дэзарыентацыя вяскоўца ў горадзе ляжаць у аснове яго негатыўных характарыстык як прасторы некамфортнай для жыццёвай дзейнасці чалавека.*

Вёска і горад з'яўляюцца аднымі з базавых элементаў еўрапейскага культурнага ландшафту, фармаванне якога цесным чынам звязана з гісторыяй развіцця аграрных супольнасцяў, сацыя-эканамічных, палітычных інстытутаў дзяржавы і ўласна феномена горада. Беларускі культурны ландшафт, як арганічная частка еўрапейскага, у гэтым сэнсе не з'яўляецца выключэннем. Функцыянальная нагрузка вёскі (сельскагаспадарчая вытворчасць) і горада (асяродак рамяства ці прамысловасці, улады, адміністрацыі, афіцыйнай рэлігіі, "высокай культуры") у структуры грамадства наклалі выразны адбітак на аблічча (ландшафт) абодвух тыпаў населеных пунктаў. Нават знешняе, візуальнае ўспрыняцце фіксуе, што архітэктурны сілуэт вёскі арганічна ўпісаны ў прыродны асяродак і практычна зліваецца з ім, а ландшафт горада рэзка вылучаецца з прыроднага кантэксту і дамінуе над ім. Адасобленасць, адмежаванасць горада ад свету прыроды акцэнтуецца і падкрэслена штучным матэрыялам яго канструявання, які не мае прыродных адпаведнікаў і не ўласцівы вёсцы ў якасці асноўнага будаўнічага матэрыялу.

Найбольш архаічны пласт міфалагічных уяўленняў адносна горада грунтуецца на яго ўспрыняцці як максімальна ўпарадкаванага і арганізаванага прасторавага локуса, абмежаванага і падкрэслена адмежаванага ад знешняй (хаатычнай, неарганізаванай) прасторы, што знаходзіць сваё адлюстраванне на лексічным узроўні (ст.-слав. градъ, параўн. літ. gaȓdas 'агароджа', ст.-інд. gṛhás 'дом'). У гэтым сэнсе горад тоесны агароджанай сядзібе і ўвасабляе сабой уласна чалавечы свет. Паказальнай з'яўляецца старажытнагерманская мадэль свету, дзе "свет людзей мысліцца як жыллё, дом, сядзіба. <…> Гэта "сярэдзінны двор" (miđgarđr), і гэткі ж, уласна, і сьвет асаў (язычніцкіх багоў скандынаваў) – ásgarđr. Гэты "Сярэдзінны двор" з усіх бакоў абступае "сьвет за агароджай" (útgarđr), прыстанішча веліканаў і іншых дэманічных сілаў" [1, с. 148].

Цэнтральнае месца горада ў міфапаэтычнай сістэме прасторавых каардынат азначаў і яго вышэйшы сакральны статус. Як адзначыў У. М. Тапароў, "звяртаюць на сябе ўвагу тыя абставіны, што горад арганізуецца (і адпаведна разглядаецца ў міфапаэтычнай традыцыі) як рытуальны цэнтр, як храм, месца ахвярапрынашэння, алтар. Ізамарфізм усіх гэтых структур выразна ўсведамляўся архаічнай міфапаэтычнай думкай, і колькасць гэтых сведчанняў у гэтай вобласці надзвычай вялікая" [2, с. 129].

Сакральны статус горада знаходзіў пацвярджэнне, асабліва для чалавека вясковага, і візуальна. Сілуэт горада дамінуе ў навакольнай прасторы, горад бачна здалёк (вёска можа "хавацца" ў лесе), ён, як іростані, замыкае на сабе дарогі (ніколі ў горад не вядзе толькі адна дарога, у той час, як для вёска гэта, хутчэй, з'яўляецца нормай). Яго храмы, палацы, камяніцы, арыентаваныя вертыкальна, "да неба", у візуальным успрыняцці стваралі ўражанне "ўзвышанасці" горада ў прасторы культурнага ландшафту. Такім чынам, горад быў "вышэй" за вёску нават у прасторавым вымярэнні, што за для чалавека традыцыі было сутнасным знакам яго сакральнай вылучанасці.

Так, у Паўночна-Усходняй Беларусі персаніфікаванае свята – Каляда – прыязджае ў свет людзей, каб адарыць іх, менавіта з Полацку: "Ехала Каляда з Полацку / Да на сівенькім конічку. / Прывезла рэшата бліноў, / Паставіла на стале, / А Раштво пасадзіла на куце" [3, с. 128]. У рэальным жыцці сакральнымі цэнтрамі прыцягнення вяскоўцаў былі гарадскія храмы і манастыры, якія нярэдка славіліся свамі цудадзейнымі рэліквіямі – абразамі ці машчамі святых. Яскравым прыкладам "святога горада" выступае Полацк, чый сакральны статус не ў малой ступені быў звязаны з культам Прападобнай Ефрасінні і масавых

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках тэмы ГБ 0814 «Этнакультурны ландшафт Беларускага Падзвіння: рэгіянальная спецыфіка і заканамернасці функцыянавання ў другой палове XIX – пачатку XXI ст.»